Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Витебский государственный
университет имени П.М. Машерова»

# IV МАШЕРОВСКИЕ ЧТЕНИЯ

## *Материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых*

**ТОМ II**

*Витебск*
*УО «ВГУ имени П.М. Машерова»*
*2010*

Репозиторий ВГУ

УДК 378.4(476.5)(06)
ББК 74.580.268(4Беи-4Вит)я431+74.583(4Беи-4Вит)я431
Ч52

Печатается по решению научно-методического совета учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова». Протокол № 5 от 23.06.2010 г.

*Материалы конференции публикуются в авторской редакции*

Редакционная коллегия:
**А.П. Солодков** (*главный редактор*),
**И.М. Прищепа, А.Л. Дединкин, В.А. Каратерзи, А.И. Матеюн**

Р е ц е н з е н т ы:
доктор физ.-мат. наук, профессор *Н.Т. Воробьёв*; канд. биол. наук, доцент *А.А. Чиркина*;
канд. пед. наук, доцент *И.В. Галузо*; доктор биол. наук, профессор *А.А. Чиркин*;
канд. биол. наук, доцент *Л.М. Мержвинский*; канд. экон. наук, доцент *С.В. Шахнович*;
канд. философ. наук, доцент *Э.И. Рудковский;* канд. пед. наук, доцент *Е.Ф. Ивашкевич*;
канд. ист. наук, доцент *В.В. Акуневич*

Репозиторий ВГУ

**Ч52** **IV Машеровские чтения** : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 28–29 октября 2010 г. / Витебский гос. ун-т; редкол. : А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : УО «ВГУ имени П.М. Машерова», 2010. – Т. II. – 432 с.
ISBN 978-985-517-265-0.
ISBN 978-985-517-267-4 (том II).

В сборник включены материалы, представленные авторами на международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых «IV Машеровские чтения» и посвященные решению актуальных научных проблем по естественным, техническим, гуманитарным наукам и методикам их преподавания. Материалы могут быть использованы научными работниками, аспирантами, преподавателями и студентами высших учебных заведений.

**УДК 378.4(476.5)(06)**
**ББК 74.580.268(4Беи-4Вит)я431+74.583(4Беи-4Вит)я431**

**ISBN 978-985-517-265-0**
**ISBN 978-985-517-267-4 (том II)**

УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2010

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫМЕТНІКАЎ У ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ А. РАЗАНАВА

**Здановіч Н.У.**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт»,*
*г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Шавель В.М.*

This article investigates the peculiarities of the use of adjectives in the poetic works of A. Ryazanov.

Прыметнік у беларускай літаратурнай мове характарызуецца функцыянальнай неаднастайнасцю, але яго стылістычную ролю як крыніцу моўнай экспрэсіі ў мастацкіх творах цяжка пераацаніць.

У творах А. Разанава прыметнікі сустракаюцца рэдка, таму выкарыстаныя паэтам словы дадзенай часціны мовы набываюць большую сэнсавую і стылістычную вагу.

Аўтар у пераважнай большасці выпадкаў выкарыстоўвае якасныя прыметнікі, якія ўваходзяць у склад словазлучэнняў і характарызуюцца наяўнасцю вобразнасці (крывавым цветам, шчакой гарачай, з непрытомнага чала, кветка жывая, цяжкае неба, лёс тужлівы, глухія камяніцы, балеснае сэрца і інш.), напрыклад: Празрысты звон, / грымотны грукат, / скалісты свіст, / магутны гул – / усе / разрозненыя гукі / цяклі, /каб зліцца / у агул… [2, с. 10]

Сярод якасных прыметнікаў можна вылучыць розныя лексіка-семантычныя групы: назвы якасцей, якія ўспрымаюцца органамі пачуццяў: гарачы, шурпаты, галодны, горкі, цяжкі, напрыклад:…Вар'яцтвам патыхала / горкі пыл / сядаў і падымаўся неахвотна… [1, с. 96]; назвы якасцей, якія ствараюць аб навакольнай рэчаіснасці прасторавыя і часавыя ўяўленні: глыбокі, далёкі, дачасны, вялікі, напрыклад:...У лотаці жоўтай / а што ўнутры / дачаснае сонца / без абалонкі… [1, с. 35]; назвы якасцей, якія раскрываюць багацце колераў і адценняў: белы, цёмны, чорны, жоўты, зялёны: ...Стары чалавек на зялёнай траве / на рэштках свайго хутарышча… [1, с. 45]; назвы якасцей, якія характарызуюць фізічныя, псіхічныя і разумовыя асаблівасці жывых істот: непрытомны, жывы, блазнаваты, стары, напрыклад: …Заблытаныя святы. / Празрэнні апярэджвалі разлік. / А людзі разумелі: / блазнаваты… [1, с. 29]; назвы якасцей, якія вызначаюць будову і ўласцівасці рэчаў: размаіты, ломкі, сыпучы: …Пясок сыпучы трэцца пад нагамі, / сінее неба, / мора-акіян / бяжыць у нерухомасці… [1, с. 13].

Якасныя прыметнікі ў творах А. Разанава рэдка ўжываюцца ў прамым значэнні, іх пераноснае значэнне вобразна перадае індывідуальнае бачанне свету пісьменнікам, напрыклад: …Шаптала штосьці лета. / А над шурпатым розумам тваім / згушчаліся зіхоткія сусветы… [1, с. 29]; …Мяне стамляе горад непрытомны, / Я не паспеў. Сутонне надышло… [1, с. 10].

Большасць выкарыстаных прыметнікаў матываваныя, утвораныя ад назоўніка суфіксальным (напрыклад: пяшчотны, разумны, дзіўны, гібельны, скрушны, гаротны, староннi і інш.) і канфіксальным (напрыклад: нявольны, ненасытны, безгалосы, непрытомны і інш.) спосабамі.

У мове паэтычных твораў А. Разанава сустракаюцца адносныя прыметнікі, якія маюць значэнне прымет ад матэрыялу або рэчыва, з якога зроблены ці складаецца прадмет: пясчаны, каменны, лістовы, напрыклад: …Куды?!– / у ростань…/ надзею…/ страту…/ Каменныя гарады / зачыняцца ў інтэрнаты… [1, с. 86]; значэнне прымет ад месца знаходжання прадмета ці часу яго існавання: лясны, ранішні, палескі, дзённы, падземны, напрыклад: …Допыт ранішні і вячорны. / Гукі белыя – / павадры. / Паскідаюць халаты – / чорна… [2, с. 174]; значэнне прымет ад яго прызначэння ці ўласцівага яму дзеяння, напрыклад: …У вышыню ўпіналіся званіцы, / і вартавыя вежы свой цяжар / трымалі змрочна: што яны вартуюць?! [1, с. 9]; назвы прымет ад яго адносін да канкрэтнай групы асоб ці пэўнай сферы дзейнасці: беларускі, людскі, сялянскі, чалавечы,напрылад: Абамлелая шчака. / Даімчыся, хваля!.. / Ярка / пыршчуць кветкі з-пад смычка… / Бе-/ла-/руская пяснярка… [1, с. 24]. Некаторыя адносныя прыметнікі пры пэўнай спалучальнасці з іншымі словамі ў аўтарскім кантэксце набываюць адценне вобразнасці, напрыклад: …Што з некім адбылося, / што з табой, – адрозніваў. / Пясчаны пошап смагі… [1, с. 29].

Рэпазітарый БарДУ

У невялікай колькасці выкарыстаны аўтарам прыналежныя прыметнікі (напрыклад: матчыны, бацькавы, савіны і інш.) ў пэўным кантэксце, пэўнай сінтаксічнай канструкцыі набываюць таксама вобразнае значэнне, напрыклад: ...Гледачы / разглядаюць сябе: / відоўня…/ Ненароджанае – / ўначы. /Бы савіныя вочы – / поўня… [2, с. 176].

Назіранні пацвярджаюць, што пераважную большасць прыметнікаў у паэтычных творах А. Разанава складаюць якасныя матываваныя прыметнікі суфіксальнага ўтварэння, якія дапаўняюць эмацыянальны фон мастацкіх твораў, робяць іх больш запамінальнымі.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Разанаў, А. Шлях–360. Паэмы і вершы / А. Разанаў ; пад рэд. У. Караткевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. – 109 с.
2. Разанаў, А. Выбранае / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. – 462 с.
3. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – 351 с.

## ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ ТВОРЧАСЦІ М. БАГДАНОВІЧА

**Злотнікава М.С.**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Русілка В.І., кандыдат філал. навук, дацэнт*

In this article the description of characteristic features of creativity of Maxim Bogdanovich contains. It reflects the basic aesthetic and poetic sights of the Belarus poet.

Максім Багдановіч застаецца адным з самых загадкавых паэтаў Беларусі. Яму належыць у беларускай літаратуры асаблівае месца. Таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вылучэнне характэрных рыс творчасці Максіма Багдановіча, паказ асноўных эстэтычных і паэтычных поглядаў беларускага песняра.

Творчасць Максіма Багдановіча пачала развівацца пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі. У ёй мы мала знойдзем матываў сацыяльнай барацьбы. Паэт як бы шукае непераходзячыя, вечныя каштоўнасці і знаходзіць іх ва ўзвышэнні, апяванні роднай Беларусі, яе народа. Праз роднае ідзе Багдановіч да агульначалавечага, як бы становячыся паэтам Красы і Прыгажосці.

Уражанні, адчуванні паэта вызначаюцца незвычайным багаццем, шматколернасцю, пералівамі фарбаў. Некаторыя настроі, пачуцці настолькі тонкія, няўлоўныя, што іх немагчыма выказаць у слове. У той жа час мы не знойдзем у Багдановіча незразумелай лексікі, стылістыкі, вобраз яго канкрэтны, прадметны. У паэзіі дамінуе спакойная апавядальная інтанацыя з незвычайнай пластыкай, адчувальнасцю.

Беларускі паэт імкнуўся перадаць «звышпачуццёвае», амаль не прыбягаючы да туманных, хісткіх, няпэўных вобразаў. Іншая справа свет лесуноў, вадзянікоў, русалак, досыць адчувальны ў багдановічаўскіх творах. Гэта, вядома, не рэалістычны свет. Але ён не выдуманы, ён існуе ў народнай свядомасці, беручы пачатак у міфалогіі. У Максіма Багдановіча міфалагічныя персанажы не толькі летаргічныя, але і недаўгавечныя. У іх вялікае мінулае, але зараз яны апускаюцца, вымiраюць. Агульны настрой міфалагічных твораў – жаль, смутак аб мінулым, да якога няма вяртання.

Для Багдановіча далёкае мінулае народа мае мастацкую, эстэтычную значнасць, і гэтае мінулае знікае, таму яго неабходна затрымаць. Максім Багдановіч як паэт перш за ўсё адметны тым, што прывіў беларускай літаратуры эстэтычныя якасці, якіх яна дасюль не мела: светаадчуванне інтэлігентнага чалавека, побач з калектыўна-грамадскай эмоцыяй (пераважна ў творах фальклорнага складу) эмоцыю асобасную, багацце, шматграннасць яе адценняў.

М. Багдановічу ў яго творчасці былі куды бліжэй выразнасць і мера ў апісаннях, дакладнасць кампазіцыі. У яго лірыцы выразна заўважаецца імкненне да зразумеласці, яснасці. Разам з тым, у сістэме эстэтычных і паэтычных поглядаў М. Багдановіча